# У Магілёве прайшоў абласны тур рэспубліканскага фестывалю «Час моцных»

14.02.2024 20:43

**Гэта фестываль роўных магчымасцяў, людзей, якія змаглі рэалізавацца, нягледзячы на свае абмежаванні ў здароўі. Больш чым 70 жыхароў Магілёўскай вобласці змаглі прадэманстраваць свае магчымасці ў вакальным, харэаграфічным, тэатральным, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Месцам падзей стаў Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы.**




На выставе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што размясцілася ў фае, было прадстаўлена больш за 100 творчых работ з дрэва, тэкстылю, фоарміяна і іншых матэрыялаў. Нельга было не захапіцца саламянымі лялькамі Вольгі Рыжовай, якая прадстаўляла Дом народнай творчасці аграгарадка Дабрэйка Шклоўскага раёна. Пры стварэнні ляляк майстрыха карыстаецца не толькі саломкай, але і ўсімі спадручнымі матэрыяламі. Акрамя гэтага яна вядзе дзіцячыя гурткі, вучыць свайму майстэрству ўсіх жадаючых.

— Галоўная ідэя ў маіх работах — дарыць людзям цяпло, — прызнаецца Вольга.

— А яшчэ я хачу знайсці свой стыль і дадаць нешта новае, чаго раней ні ў каго не было.

Шмат таленавітых аўтараў жыве на Хоцімшчыне. Хоцімскі раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва прывёз на фестываль работы васьмі ўдзельнікаў.

— Нашы рабяты ходзяць да нас з 2010 года і авалодалі ўжо шматлікімі методыкамі работы з ільняной ніткай, вышыўкай крыжыкам, вязаннем, — паведаміла загадчык аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Святлана Гаўрыленка. — У сваіх работах яны дэманструюць сямейныя каштоўнасці і традыцыі беларускай культуры.




Не менш змястоўнай была культурна-забаўляльная праграма з танцамі, дэкламацыяй вершаў уласнага сачынення, спевамі, дэманстрацыяй старадаўняга абраду.

Абрад пад назвай «Свечка» прэзентаваў Кіраўскі раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

—На гэтую ідэю нас натхнілі калегі з Цюменскай вобласці, — распавялі інструктары па працоўнай тэрапіі аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Анжэла Горбач і Вераніка Пятруша. — Гэты абрад у Расіі сталі праводзіць перасяленцы з Магілёўскай вобласці, якія там уладкаваліся і пачалі адраджаць свае традыцыі. У старыя часы людзі раз у год пераносілі абраз з дому ў дом і перадавалі новым гаспадарам з найлепшымі пажаданнямі. Дарогу яны высцілалі тканымі дарожкамі і ручнікамі. Абрад праводзіўся ў вёсках вельмі аддаленых, дзе не было цэркваў, і дом, дзе заставаўся абраз, лічыўся храмам. Там заўсёды былі адчыненымі дзверы, каб любы жадаючы мог зайсці.

Супрацоўніцы паведамілі, што ўсяго ў іх аддзяленні займаюцца 32 чалавекі.

З цікавым нумарам прыехаў у Магілёў дзіцячы тэатр танца «Калінка» Мсціслаўскага раённага Цэнтра культуры, якому споўнілася ўжо 20 гадоў. Яго наведвальнік Улад Палеяў прадэманстраваў інклюзіўны нумар, ініцыятарам якога быў ён сам.




— Мы пачулі, як Улад незвычайна спявае, акампануючы сабе на варгане, і вырашылі дапоўніць яго нумар харэаграфічнай замалёўкай, — расказала кіраўніца тэатра Ірына Рыжкова. — З Уладам супрацоўнічаем усяго год, а ўжо пабывалі з выступленнем у Смаленску, цяпер вось у Магілёве.

Кожны нумар — маленькая ўнікальная гісторыя. І такіх гісторый было шмат. Усе, хто прычыніўся да гэтай творчасці, атрымаў прыліў станоўчых эмоцый. І зразумеў, што хвароба творчасці не перашкода.

— Адбор нумароў для абласнога тура праводзіла экспертная камісія ў складзе рэжысёра-пастаноўшчыка «Маладзёжнага тэатра эстрады» Вадзіма Нікрэвіча і старшага выкладчыка кафедры рэжысуры факультэта мастацкай культуры Беларускага дзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў Кірыла Шыка, — паведаміла вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадцэнтра НТ і КАР Крысціна Башарымава. — Цікава, што ўдзельнікі фестывалю на пытанне, што робіць іх моцнымі, адказвалі прыкладна адно і тое ж — воля да жыцця і адзінства. А яшчэ іх моц у веры і надзеі. Фестываль праводзіцца ўпершыню, але ёсць надзея, што ён прыжывецца і стане адным з найцікавейшых у нашай фестывальнай скарбонцы. Ён накіраваны на стварэнне роўных умоў для выяўлення і развіцця творчых здольнасцей грамадзян з інваліднасцю і іх інтэграцыі ў грамадскае жыццё.

Арганізатарамі фестывалю з'яўляецца Міністэрства культуры, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам. Лепшыя з удзельнікаў прадстаўляць свае рэгіёны на галоўнай сцэне рэспубліканскага фестывалю роўных магчымасцей «Час моцных» 3 мая.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**